# Грашовыя даходы і расходы Віленскага ўніверсітэта (1803–1823 гг.)

**А. У. Ерашэвіч,**
дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт

*З актуальнымі пытаннямі трансфармацыі вышэйшай школы суадносяцца цяжкасці, якія датычацца пошуку аптымальнага механізма і прыдатных інструментаў адносна аб'ёму і крыніц фінансавання ўстаноў вышэйшай прафесійнай адукацыі. Патрабуе вырашэння праблема сувязі эфектыўнасці і выніковасці расходавання ў патрэбных суадносінах дзяржаўных бюджэтных і пазабюджэтных грашовых сродкаў, іх размеркавання ўнутры ВНУ, наладжвання сістэмы кіравання і кантролю за фінансавымі патокамі структуры даходаў і выдаткаў.*

Як вядома, для забеспячэння навучальна-метадычнай, навукова-даследчай і выхаваўча-ідэалагічнай дзейнасці ўстаноў прафесійнай вышэйшай адукацыі неабходны фінансавыя рэсурсы, якія ўключаюць групы даходаў і расходаў. Асноўныя даходы вышэйшыя навучальныя ўстановы могуць атрымліваць за кошт аплаты навучання, дзяржаўнага фінансавання (субсідый), грамадскіх збораў і прыватных ахвяраванняў, ад вынікаў гаспадарчай дзейнасці і продажу ўласнасці. Неабходныя расходы, як правіла, уключаюць выдаткі на адміністраванне, аплату працы прафесарска-выкладчыцкага складу і заробак дапаможнага вучэбнага персаналу, гаспадарчае ўтрыманне інфраструктуры (будаўніцтва, рамонт, утрыманне памяшканняў, плацяжы камунальныя, за сродкі сувязі і інш.), сацыяльнае забеспячэнне навучэнцаў (стыпендыі і інш.), падтрымку ў належным стане сістэмы дадатковай прафесійнай адукацыі (падрыхтоўка і перападрыхтоўка кадраў, павышэнне кваліфікацыі) і інш. Таму вывучэнне гістарычнага вопыту фінансавання цэнтраў вышэйшай адукацыі на беларускіх землях у мінулым прадстаўляе бясспрэчную цікавасць.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 11.05.2022.

Гісторыі імператарскага Віленскага ўніверсітэта – аднаго з вядучых цэнтраў адукацыі і навукі беларускіх зямель у першай трэці XIX ст. – прысвечана шмат публікацый польскіх, літоўскіх, беларускіх і іншых аўтараў. Асноўную ўвагу даследчыкі звярталі на ўклад выкладчыкаў і выпускнікоў гэтай навучальнай установы ў развіццё розных галін ведаў і ў працэс навуковага вывучэння краю, на ўдзел студэнтаў у грамадска-палітычным жыцці беларуска-літоўскага рэгіёна Расійскай імперыі. У кантэксце вывучэння фарміравання сістэмы адукацыі і навукі ў Беларусі роль Віленскага ўніверсітэта разглядаў беларускі вучоны В. А. Шаршуноў [1]. Найбольш падрабязныя звесткі аб розных аспектах жыццядзейнасці Віленскага ўніверсітэта ўтрымліваюцца ў працах польскага гісторыка і медыка Ю. Бялінскага (1848–1926) [2]. Асобныя аспекты матэрыяльнага стану прафесарска-выкладчыцкага складу разглядаў французскі славіст Д. Бавуа [3, s. 107–134]. Тым не менш у беларускай гістарыяграфіі адсутнічаюць навуковыя даследаванні, прысвечаныя аналізу фінансавага забеспячэння дзейнасці гэтай шматпрофільнай установы вышэйшай адукацыі.

Мэта артыкула – вызначыць крыніцы даходаў, высветліць у дынаміцы памеры і ахарактарызаваць структуру грашовага ўтрымання імператарскага Віленскага ўніверсітэта ў 1803–1823 гг., да моманту яго чарговай рэарганізацыі, якая супала з падаўленнем дзейнасці тайных маладзёжных аб'яднанняў. Асноўнымі крыніцамі сталі апублікаваныя Ю. Бялінскім штогодныя каштарысныя рахункі штатных сум, прызначаныя на ўтрыманне Віленскага ўніверсітэта, у 1804–1808, 1810–1814, 1816–1820, 1822, 1823 гг.

У 1803 г. Галоўная Віленская школа была рэарганізавана ва ўніверсітэт. Акт ад 04.04.1803 аб зацвярджэнні імператарскага ўніверсітэта ў Вільні замацоўваў, што на яго ўтрыманне з 1803 г. выдаткоўвалася 105 000 руб. серабром штогод з даходаў паезуіцкіх маёнткаў. Прызначаная з даходаў адукацыйнага фундушу, належная штатная штогодная сума пасля асігнавання дзяржаўнага казначэя тройчы ў год адпускалася з Віленскай казённай палаты і паступала ва ўніверсітэцкую касу ў распараджэнне рэктара і ўніверсітэцкага савета [4, т. 27, № 20701, с. 528]. У параўнанні з 1800 г. урадавыя асігнаванні на вышэйшую навучальную ўстанову ў Вільні павялічыліся ў 1,6 раза (з 65 442 руб. 90 кап. да 105 000 руб. серабром) [2, t. 1, s. 319–323].

На супрацоўнікаў універсітэта распаўсюджвалася дзеянне чыноўніцкага табеля аб рангах: рэктар адносіўся да 5-га класа, прафесары і людзі роўнай вартасці з імі – да 7-га, дактары – да 8-га, магістры – да 9-га, кандыдаты – да 12-га. Студэнты-выпускнікі

пры накіраванні на службу атрымлівалі чын 14-га класа. Прафесар пасля 25 год беззаганнай службы набываў ганаровае званне эмерыта, атрымліваў пажыццёвую пенсію ў памеры ранейшага поўнага жалавання і мог працягваць працу на ранейшай пасадзе. Прафесары і ад'юнкты ўніверсітэта з невылечнымі хваробамі разлічвалі на пенсію ў памеры поўнага ці палавіны ранейшага жалавання. Права на атрыманне аднаразовага штогоднага жалавання ці пенсій мелі ўдовы прафесараў і настаўнікаў (да ўступлення ў новы шлюб) і дзеці (да 21-гадовага ўзросту альбо да моманту выдачы дачок замуж і прызначэння сыноў на сапраўдную службу). За выкладанне поўнага і галоўнага курса прафесар павінен быў атрымліваць 1000 руб., за дадатковы – 500 руб. серабром штогод, разам – 1500 руб. серабром [4, т. 27, № 20701, с. 528, 529]. Віленскі ўніверсітэт быў падзелены на чатыры факультэты. У аддзяленнях фізічных і матэматычных, а таксама маральных і палітычных навук былі вызначаны 10 галоўных курсаў, на медыцынскім факультэце – 7, літаратуры і прыгожых мастацтваў – 5. Выкладанне гэтых галоўных курсаў павінны былі забяспечваць 32 абраныя прафесары. На кожным з факультэтаў універсітэцкае кіраўніцтва мела права прызначаць дадатковыя курсы, якія павінны былі чытаць прафесары і здатныя ад'юнкты [4, т. 27, № 20765, с. 610–620].

У цэлым з 1803 г. Віленскі ўніверсітэт, выкладанне ў якім вялося на польскай мове і па вучэбных праграмах былой Адукацыйнай камісіі, фактычна меў аўтаномны статус і па сваёй арганізацыі шмат у чым нагадваў нямецкія ўніверсітэты ў Йене і Гётынгене, у якіх была ўвасоблена ў жыццё мадэль класічнага еўрапейскага ўніверсітэта як асобнай секулярнай дзяржаўнай установы, якая сумяшчала адукацыйныя, навукова-даследчыцкія функцыі, знаходзілася пад кантролем дзяржавы, валодала наборам акадэмічных свабод (асобныя юрысдыкцыя і рэгламент дзейнасці, прывілеі на камплектаванне кадраў і выбар прафесарска-выкладчыцкага складу, правы на прысваенне вучоных ступеняў, вучэбнае самакіраванне, універсітэцкі суд, ажыццяўленне цэнзуры, фінансавае і матэрыяльнае забеспячэнне). Трэба нагадаць, што ў пачатку XIX ст. Віленскі ўніверсітэт меў высокі навуковы патэнцыял і педагагічны ўзровень выкладання і па многіх галінах ведаў апярэджваў заходнееўрапейскія цэнтры вышэйшай адукацыі таго часу. Напрыклад, эканамічная тэорыя фізіякратаў выкладалася ў Вільні з 1783 г. У Віленскім, а потым і ў Маскоўскім (1804 г.) універсітэтах упершыню ў вышэйшай школе пачалі вывучаць палітычную эканомію, якая паводле зместу больш эвалюцыяніравала ў бок эканамічнай тэорыі, а не вузкай камералістыкі, якую прадстаўлялі арганізаваныя ў XVIII ст. кафедры камералістыкі ў нямецкіх універсітэтах. Самастойная кафедра палітычнай эканоміі ўзнікла ў Англіі ў 1805 г., а ў Францыі першым прафесарам эканомікі лічыцца Ж. Б. Сэй (1819 г.).

Вышэйшая навучальная ўстанова ў Вільні стала каардынацыйным адміністрацыйна-распарадчым, вучэбна-метадычным, навукова-даследчым цэнтрам для ўсіх навучальных устаноў Віленскай навучальнай акругі. Пры Віленскім універсітэце існавала шмат асобных навуковых і вучэбна-дапаможных устаноў: бібліятэка, друкарня, кнігарня, аптэка, анатамічна-паталагічны, хімічны, фізічны, машын, мінералагічны, нумізматычны, заалагічны, зоатамічны кабінеты, ветэрынарны інстытут, хірургічная, акушэрская, тэрапеўтычная клінікі, анатамічны тэатр, музей капыт і падкоў пры ветэрынарным інстытуце, астранамічная абсерваторыя, музей старажытнасцей, батанічны сад.

Акрамя дапаможных навуковых і вучэбных устаноў, у непасрэдным кіраванні Віленскага ўніверсітэта знаходзіўся шэраг навучальных устаноў ніжэйшых разрадаў. Правобразам будучых навукова-даследчых інстытутаў былі створаныя пры медыцынскім факультэце інстытут вакцыны (1808 г.) і інстытут мацярынства (1809 г.). З супольнай універсітэцкай касы забяспечвалася Віленская гімназія, якая знаходзілася ў адным з універсітэтам доме. Асобныя выплаты ішлі на Галоўную духоўную семінарыю, апроч аплаты выкладання навуковых прадметаў, на медыцынскі інстытут, семінарыю парафіяльных настаўнікаў, педагагічны інстытут і канвікт з фундушу графа М. Валіцкага, які ў 1807 г. прызначыў штогод 12 000 злотых, якія паступалі з маёнтка Азёры ў Гродзенскім павеце, на навучанне 8 шляхецкіх юнакоў [5, s. 108, 110, 111].

Віленскі ўніверсітэт паводле штогодна асігнаванай сумы на яго ўтрыманне (105 000 руб. серабром) пасля паступовага падзення пакупальніцкай здольнасці папяровых асігнацый стаў адным з самых «багатых» з ліку адкрытых у ходзе правядзення адукацыйнай рэформы 1802–1804 гг. імператарскіх універсітэтаў, у якіх штогодная штатная сума ўтрымання дасягала 130 000 руб. асігнацыямі.

Згодна са штатным роспісам ад 18.05.1803 [6, т. 1, штаты и приложения, с. 2–3; 4, т. 44-2, к № 20765, с. 196], сума ўтрымання Віленскага ўніверсітэта размяркоўвалася наступным чынам: на патрэбы факультэтаў альбо на выдачу жалавання выкладчыкам адлічвалася 57 700 руб. (54,9 %), на забеспячэнне функцыянавання асобных навукова-даследчых устаноў і дапаможных вучэбных структур (кабінетаў, школ, батанічнага сада, астранамічнай абсерваторыі, бібліятэкі) – 11 700 руб. (11,1 %), акадэмічных дамоў і ўніверсітэцкай царквы – 7320 руб. (7 %), на замежныя і ўнутраныя камандзіроўкі – 7000 руб. (6,7 %), на выдачу пенсій заслужаным дзеячам адукацыі – 6000 руб. (5,7 %), на падрыхтоўку настаўнікаў – 4500 руб. (4,3 %), на падтрымку служыцелей і канцылярыі – 3750 руб. (3,6 %), на праўленне – 3300 руб. (3,1 %), на надзвычайныя выдаткі – 2130 руб. (2 %), на ўзнагароды – 1000 руб. (0,9 %), на выпіску газет і часопісаў – 600 руб. (0,6 %).

У цэлым прыкладна на заробак асобам з універсітэцкага персаналу трэба было выдаткоўваць 84 870 руб. (80,8 %), а на ўтрыманне ў належным стане розных па прызначэнні будынкаў і абсталявання – 20 130 руб. (19,2 %). Заўважым, што актыўны дзеяч Адукацыйнай камісіі Г. Калантай, які распрацаваў у 70–80-х гг. XVIII ст. праект рэфармавання сістэмы адукацыі ў Рэчы Паспалітай, раіў са штогоднага штатнага даходу выдаткоўваць на патрэбы ўніверсітэта 73 000 руб. серабром, а астатнія 32 000 руб. серабром прызначаць да выдачы эмерытам, на асобныя ўзнагароды, памнажэнне звышштатнага жалавання, друкаванне навуковых прац, ажыццяўленне эксперыментаў, упрыгожванне дамоў, зборы, забеспячэнне дзейнасці інстытута мастацтва (акадэміі навук), падтрымку вольных навук і майстэрстваў (мастацтваў). Ён прапанаваў далучыць да ўніверсітэцкага скарбу бенефіцыяльныя даходы. На яго думку, секулярызаваныя бенефіцыі маглі павялічыць удвая фундушавыя даходы былой Галоўнай Віленскай школы [2, t. 1, s. 72–76].

Акрамя пастаяннай крыніцы ўтрымання, вышэйшая навучальная ўстанова ў Вільні мела яшчэ аднаразовыя непастаянныя фінансавыя сродкі. Так, у кастрычніку 1804 г. імператар Аляксандр I адобрыў выдзяленне дадатковага аднаразовага звышштатнага ўзносу ў 70 000 руб. з паезуіцкай сумы, які выдаткоўваўся на першапачатковыя патрэбы ўладкавання ўніверсітэта (40 000 руб. з рэшткам у 21 793 руб. 84 кап.), у тым ліку на паляпшэнне дзейнасці клінікі вылучалася 20 000 руб., бібліятэкі – 15 000, фізічнага кабінета – 5000, кабінета хірургічных інструментаў – 3000, друкарні – 3000, хімічнай лабараторыі – 2000 руб., а астатнія 13 793 руб. 84 кап. прызначаліся для будаўніцтва аранжарэі і анатамічных памяшканняў [2, t. 1, s. 284–285]. У 1807 г. намаганнямі папячыцеля А. Чартарыйскага Віленскаму ўніверсітэту была адпушчана субсідыя ў памеры 30 000 руб., а ў 1811 г. – яшчэ 60 000 руб. для пабудовы і папаўнення фондаў бібліятэкі з мэтай набыцця кніг, абсталявання мінералагічнага кабінета [7, t. 1, s. 658; 2, t. 3, s. 539].

Віленскі ўніверсітэт меў не толькі пастаянныя штатныя і выпадковыя звышштатныя сумы ўтрымання. Згодна з інструкцыяй касіра Віленскага ўніверсітэта, распараджэннем міністра народнай асветы ад 17.08.1823 і загадам куратара да рэктара Віленскага ўніверсітэта ад 30.09.1823, у супольнай касе Віленскага ўніверсітэта павінны былі захоўвацца пяць сум:

1) уласна ўніверсітэцкая штатная;

2) пастаянная бенефіцыяльная сума з даходаў духоўных маёнткаў, якая ўносілася сялянамі і трымальнікамі ў розныя тэрміны па кантрактах (паводле акта ад 04.04.1803 і імператарскага ўказа ад 04.03.1805);

3) часовая 7%-ная сума з капіталу ў 300 дукатаў, запісанага прафесарам Сарторыусам на клініку, з даходаў м:роў, друкарні, іншых выпадковых крыніц;

4) экстраардынарная аднаразовая сума, прызначаная імператарскім загадам ад 03.06.1811, для ўтрымання мінералагічнага кабінета і бібліятэкі (у рэштках засталося 925 руб. 26 кап.);

5) выдаваемыя ўніверсітэтам зборы за патэнты і атэстаты ў адпаведнасці з пастановай ад 13.06.1817.

У распараджэнні Віленскага ўніверсітэта знаходзіліся і іншыя сумы, якія пералічваліся на ўтрыманне Віленскай гімназіі (штатная ад 18.05.1803, якая выдаткоўвалася з Віленскай казённай палаты тройчы ў год), эмерытаў, на школы ў Коўне, Крожах, на забеспячэнне дзейнасці школы парафіяльных настаўнікаў і арганістаў (паводле штата ад 09.07.1809), выдаваемыя з адукацыйнага фундушу 320 руб. серабром, прызначаныя на штогоднае ўтрыманне двух вучняў з фаміліі Віхертаў (пакінутыя сумы з Гродна), штогодная сума ў 5000 руб. серабром і банкаўскія працэнты з сум удоў і сірат школьных чыноўнікаў, згодна з імператарскім указам ад 08.11.1815, якія выдаваліся з Віленскай казённай палаты з даходаў адукацыйнага фундушу.

Пасля 1803 г. паступалі яшчэ грашовыя сродкі з так званых пяці архіўных даходаў прыватных капіталаў вучняў, устаноў, прыватных фундатараў. Паводле імператарскага ўказа ад 23.01.1809 з Віленскай казённай палаты выдаткоўвалася штогод на ўтрыманне ўпаўнаважанага 2900 руб. серабром і яшчэ паводле старадаўняга штата высылалася на фінансаванне архіва адукацыйнага фундушу 1350 руб. серабром, разам – 4250 руб. серабром. Згодна з дэкрэтамі Віленскай судова-адукацыйнай камісіі, ва ўніверсітэцкай касе меліся ў невядомай колькасці сумы з выпадковых аплат, якія паступалі ў Віленскую казённую палату ці размяшчаліся ў крэдытных установах пад працэнты. Да гэтых сум далучаліся даходы з уладанняў Трышэк і Вяцёр, якія былі атрыманы ад судовай камісіі і заставаліся ў кіраванні Віленскага ўніверсітэта за даўгі адукацыйнага фундушу. Нарэшце, у касе ўніверсітэта знаходзіліся дасылаемыя са школ сумы, прызначаныя для набыцця кніг, інструментаў і球 рознага навуковага дапаможнага абсталявання.

У той жа час Віленскі ўніверсітэт не меў права самастойна распараджацца пэўнымі сумамі: казённай, выдаваемай з Віленскай казённай палаты тройчы ў год, згодна з уставам ад 15.11.1820, для ўтрымання дзяржаўных вучняў пры Медыцынскім інстытуце і штогоднай семінарскай у 15 000 руб. серабром, якая адпускалася, згодна з імператарскай пастановай ад 18.07.1803, на ўтрыманне Галоўнай духоўнай семінарыі пры ўніверсітэце за кошт складчыны са збораў рымска-каталіцкіх кляштараў і дадатковага даходу з дому так званага папскага алюмната ўказам ад 20.02.1810, прызначанага на ўтрыманне той жа семінарыі [2, t. 1, s. 452–455; 5, s. 113–115].

Згодна з ведамасцю расходаў паезуіцкіх даходаў з 1803 па 1806 г., з агульнай сумы ў 574 824 руб. серабром на ўтрыманне Віленскага ўніверсітэта выдаткоўвалася 327 885 руб. 16,5 кап. (57 %), акрамя 70 000 руб. серабром, якія пералічваліся ў ведамства

Віленскага ўніверсітэта на асобныя патрэбы яго і вучылішчаў навучальнай акругі [8, стб. 777–780].

Віленскі ўніверсітэт карыстаўся мэтавымі паезуіцкімі даходамі з некалькіх маёнткаў, размешчаных на тэрыторыі беларускіх губерняў. З прычыны таго, што памешчык Магілёўскай губерні Гласко не выплачваў працэнты па доўгу паезуіцкага капітала ў 12 333,33 руб. серабром былой Адукацыйнай камісіі, яго маёнтак Ваціёр (Вяцёр) Сенненскага павета (80 душ мужчын) паступаў у адміністрацыйнае кіраванне ў ведамства Віленскага ўніверсітэта [9, арк. 46–46 адв., 51–52]. У 1826 г. Віленскі ўніверсітэт атрымліваў 8440,94 руб. серабром даходаў з першых паезуіцкіх маёнткаў у Віцебскай і Магілёўскай губернях [10, с. 120]. Перададзеныя на яго карысць паезуіцкія маёнткі знаходзіліся ў арэндзе і былі абцяжараны даўгамі. У прашэнні ад 17.05.1824 віцебскаму генерал-губернатару М. М. Хаванскаму памешчык Сенненскага павета С. С. Вільчынскі прасіў прыпыніць продаж з публічнага торгу яго маёнтка Лаўрановічы за даўгі па маёнтку Вяцёр, арандуемага ім у Віленскага ўніверсітэта. Уся нядоімка ў 5471 руб. 60 кап. не пакрывала штогоднага даходу маёнтка ў 4820 руб. 23 кап., але перавышала банкаўскую закладную ацэнку прыгонных (за 25 мужчын і 15 жанчын выходзіла разам 8125 руб. з улікам кошту ў 250 руб. за мужчыну і 125 руб. за жанчыну) [1, арк. 1–2 адв., 8, 10, 16–16 адв.].

Яшчэ адной крыніцай прыбытку Віленскага ўніверсітэта выступалі так званыя бенефіцыяльныя даходы. У 1805 г. Віленскаму ўніверсітэту было прадпісана абраць люстратараў для дакладнага вылічэння бенефіцыяльных даходаў [4, т. 28, № 21649, с. 885–887]. У 1823 г. з 38 526 руб. 97,5 кап. серабром бенефіцыяльных даходаў з рэшткай на патрэбы Віленскага ўніверсітэта адпускалася 10 649 руб. 75 кап. (27,6 %) [2, t. 1, s. 375–383].

Згодна са штатам ад 18.05.1803, да канца 1803 г. з 105 773 руб. 30,5 кап. (973 руб. 30,5 кап. рэштку і 104 800 руб., атрыманых у 1803 г.) было выдаткавана толькі каля паловы штогоднай штатнай сумы – 50 772 руб. 47,5 кап. (48 %) [2, t. 1, s. 323–327]. Аналіз дынамікі руху сум Віленскага ўніверсітэта за 1803–1823 гг. [2, t. 1, s. 323, 326–327, 330, 332, 334, 335, 337–339, 344–346, 350–352, 354, 359–360, 366, 367] сведчыць аб тым, што прыход фінансавых сродкаў з улікам рэштак перавышаў, за выключэннем 1812–1814 гг., штатнае штогоднае асігнаванне ў 105 000 руб. серабром. Але штогодныя расходы за асобныя гады (1803, 1807–1808, 1811–1814, 1820), як правіла, не дасягалі штатнай сумы (вагаліся ад 20 307 руб. у 1811 г. да 102 781 руб. у 1820 г.), часта ва ўніверсітэцкай касе заставаліся рэшткі грошай ад мінулых гадоў. У той жа час у астатнія гады назіралася фінансаванне ў звышштатных памерах (ад 108 379 руб. у 1810 г. да 147 072 руб. серабром з дадаткам 532 руб. асігнацыямі ў 1816 г.). Гэта тлумачылася пагашэннем пазык і нявыдач у папярэднія гады і, як ужо адзначалася, звышкаштарыснымі грашовымі паступленнямі ў асобныя гады.

Зразумела, што на аб'ёмы фінансавання Віленскага ўніверсітэта паўплывалі падзеі, звязаныя з разбуральным напалеонаўскім нашэсцем. У 1814 г. Віленскі ўніверсітэт разам з гімназіяй замест сумы ў 130 000 руб. атрымаў толькі 20 000 руб. серабром [7, t. 1, s. 744]. У час знаходжання ў 1807 г. на рэктарскай пасадзе Я. Снядэцкага ва ўніверсітэцкай касе было ў наяўнасці толькі 600 руб. пры 6000 руб. доўгу, які пасля 1813 г. павялічыўся да 50 000 руб. серабром. У дадатак штогод з бенефіцыяльнай сумы ўніверсітэт павінен быў адлічваць 1000 руб. серабром на карысць спаленых і абрабаваных касцёлаў [7, t. 2, s. 414, 415]. З прычыны недахопу штатнай сумы ў пасэсараў паезуіцкіх уладанняў і трымальнікаў капіталаў у 1813 г. было пазычана 1352 руб. 70 кап. серабром, у 1814 г. – 5569 руб. 44,5 кап. серабром, у 1816 г. – 19 608 руб. 58,5 кап. серабром і 60 руб. асігнацыямі [2, t. 1, s. 365].

На велічыню расходаў універсітэта ўплывалі і адміністрацыйна-арганізатарскія здольнасці яго рэктараў. Апублікаваныя Ю. Бялінскім звесткі дазваляюць у цэлым прасачыць у дынаміцы структуру выдаткаў і высветліць суадносіны планавых і рэальных выплат у Віленскім універсітэце за 1803, 1805–1808, 1810–1814, 1816–1820, 1823 гг., хоць артыкулы расходаў не былі ўніфікаваныя і часам утрымлівалі несупадаючыя для параўнання даныя. Да таго ж, згодна з існуючай практыкай, з акладаў служачых у Віленскім універсітэце адлічвалі 1 % на забеспячэнне шпіталяў, але за некаторыя гады ўказваліся намінальныя, а за іншыя – рэальныя сумы грашовых выдач. Зразумела, што з прычыны фактычных штогодных змен асабовага складу, часовасці і аднаразовага характару некаторых адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў велічыня расходаў вагалася і магла не супадаць са штатным роспісам.

Як бачна з прыведзенай ніжэй табліцы, на фінансавую падтрымку розных катэгорый персаналу Віленскага ўніверсітэта выдаткоўвалася ад 62,8 (1805 г.) да 72,8 % (1823 г.) грошай, а на забеспячэнне функцыянавання пераважна нерухомай інфраструктуры – ад 37,2 (1805 г.) да 27,2 % (1823 г.). З 1805 па 1823 г. павялічыўся адносны паказчык расходаў на жалаванне выкладчыкам (з 50,7 % да 59,6 %), дапаможнаму вучэбнаму персаналу (з 1,9 да 3,5 %), на ўтрыманне дапаможных навукова-даследчых і вучэбных устаноў (з 7,9 да 16,3 %), паменшыліся гаспадарчыя сумы грашовага забеспячэння (з 29,3 да 10,9 %). Амаль нязменнымі засталіся аклады адміністратараў (6–6,5 %) і фінансавыя сродкі, неабходныя для падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў (3,6–3,7 %).

Разгледзім больш падрабязна некаторыя важныя артыкулы выдаткаў Віленскага ўніверсітэта, неабходныя для фінансавага ўтрымання прафесарска-выкладчыцкага корпуса. Асноўны навуковы і вучэбны персанал Віленскага ўніверсітэта ўключаў выкладчыкаў розных ступеняў навукова-вучэбных дапаможных

*Табліца*

**Структура расходаў Віленскага ўніверсітэта ў 1805 і 1823 гг.**

| Артыкул выдаткаў | 1805 | | 1823 | |
|---|---|---|---|---|
| | руб. | % | руб. | % |
| Аплата працы прафесарска-выкладчыцкага складу | 54 694,59 | 50,7 | 64 023,11 | 59,6 |
| Аплата працы дапаможнага вучэбнага персаналу | 2100,00 | 2,0 | 3732,3 | 3,5 |
| Аплата асобам з адміністрацыйнага апарату | 6950,00 | 6,5 | 6477,54 | 6,0 |
| Выплаты для падрыхтоўкі настаўнікаў | 3882,00 | 3,6 | 3977,01 | 3,7 |
| Утрыманне дапаможных навукова-даследчых і вучэбных устаноў, так званых школ, кабінетаў, бібліятэкі, батанічнага саду | 8535,00 | 7,9 | 17 481,66 | 16,3 |
| Гаспадарчыя (эканамічныя) выдаткі (утрыманне памяшканняў і служачых пры іх, набыццё рухомай і нерухомай маёмасці і інш.) | 31 627,00 | 29,3 | 11 759,74 | 10,9 |
| Разам | 107 788,59 | 100,0 | 107 451,36 | 100,0 |

супрацоўнікаў (лабаранта хімічнай лабараторыі, садоўніка батанічнага сада, празектара анатамічнага кабінета, бібліятэкара з памочнікамі і інш.). Згодна са штатам 1803 г., на чатырох факультэтах павінны былі працаваць 32 прафесары, 12 ад'юнктаў (памочнікаў прафесараў), 4 цэнзары кніг, настаўнікі моў, «прыгожых» мастацтваў і фізічнага выхавання. У Віленскай Галоўнай школе ў штаце налічвалася 18 прафесараў, 14 ад'юнктаў, 3 лектары моў, механікі і прафесар музыкі. Як відаць, колькасць выкладчыкаў, якія чыталі 32 асноўныя і столькі ж дапаможных курсаў ці кафедр, у Віленскім універсітэце была павялічана. З 1803 па 1832 г. у Віленскім універсітэце працавала не менш за 125 прафесараў, у тым ліку прыкладна 56 % з іх, уключаючы 90 % прафесараў медыцыны, паходзілі з беларускіх зямель [2, t. 3, s. 107–366].

У 1803–1826 гг. у Віленскім універсітэце працавала ад 17 (1825 г.) да 49 (1823 г.) выкладчыкаў, у тым ліку ад 17 (1825 г.) да 27 (1812 г.) прафесараў, ад 6 (1818 г.) да 13 (1803 г.) ад'юнктаў, ад 9 (1816 г.) да 14 (1818–1823, 1826 гг.) іх памочнікаў. За ўвесь час існавання ўніверсітэта так і не былі заняты ўсе штатныя прафесарскія пасады, а таксама часткова пасады ад'юнктаў, акрамя 1803–1807 гг. Для заахвочвання прыезду на працу ў Віленскі ўніверсітэт замежных вучоных прадугледжваліся розныя фінансава-маёмасныя стымулы. Звычайна прафесары атрымлівалі штогод ад 900 да 1500 руб., а ад'юнкты – ад 300 да 500 руб. Да 1811 г. настаўнікам французскай і нямецкай моў плацілі па 500 руб., грэчаскай і англійскай – па 300 руб., мэтрам музыкі, танцаў і фехтавання – па 200 руб., разам – 2200 руб. (у 1818–1819 гг. 2475 руб.). Пасля 25 гадоў працы прафесар атрымліваў поўную эмературу. Прафесарам у 1805–1823 гг. супольна выплачвалі штогод ад 32 520 руб. (1807 г.) да 42 080 руб. 53 кап. (1811 г.). 12 ад'юнктам у 1805–1811 гг. адпускалі ад 4927 руб. 77 кап. (1811 г.) да 6000 руб. (1805 г.), у 1818 г. – 3173 руб. (іх памочнікам і намеснікам 5249 руб. 90 кап.), у 1819 г. – 4271 руб. 25 кап. (5156 руб. 17 кап.), у 1823 г. – 5501 руб. 37 кап. (4585 руб. 68 кап.). У цэлым прафесары і ад'юнкты, апроч штатнага жалавання, мелі магчымасць дадатковага заробку ці іншыя крыніцы грашовага ўтрымання. З цягам часу рабіліся ўдакладненні ў памерах выплат асобных прадстаўнікоў выкладчыцкага корпуса.

Параўнанне памераў афіцыйных зарплат розных прафесараў, аналіз дыяпазону акладаў прафесарска-выкладчыцкага складу і навукова-вучэбных дапаможных супрацоўнікаў дазваляе зрабіць выснову, што ўлічвалася кваліфікацыйная адзнака, і ў цэлым высокакваліфікаваная інтэлектуальная праца аплачвалася вышэй. Дацэнты альбо лектары атрымлівалі ад 300 да 400 руб. штогод, ад'юнкты – 800 руб., звычайныя прафесары – 1500 руб., надзвычайныя прафесары (асобы, якія замяшчалі іх на пасадзе. – *А. Е.*) – 1000 руб. штогод з дадаткам кватэр. Падобнае матэрыяльнае стымуляванне прыводзіла да таго, што пасля атрымання ступені звычайнага прафесара выкладчыкі спынялі працэс самаўдасканалення [12, s. 75].

Для высвятлення ступені матэрыяльнага дабрабыту прафесарска-выкладчыцкага складу Віленскага ўніверсітэта неабходна вызначыць пакупніцкую здольнасць іх рэальных і намінальных заробкаў (зарплат і пенсій) з улікам узроўню цэн на тавары і паслугі ў горадзе. На жаль, за першую трэць XIX ст. вядомы толькі рознічныя цэны на жыта і авёс. Тым не менш, па меркаванні саміх удзельнікаў адукацыйнага працэсу, прафесарскі заробак у 1500 руб. без уліку дадатковых фінансавых сродкаў не забяспечваў прыдатнае сталаванне ў Вільні.

У цэлым у 1814 г. рэктар, 4 дэканы, 2 сакратары, 21 прафесар, астраном, 8 ад'юнктаў, 9 памочнікаў ад'юнктаў, настаўнікі моў, мэтры, празектар і ветэрынар супольна атрымалі 47 114 руб. У 1816 г. рэктару, 4 дэканам, 2 сакратарам, 23 прафесарам, астраному, 7 ад'юнктам, іх памочнікам, празектарам анатоміі і заатоміі, ветэрынару, наглядчыку мінералагічнага кабінета, настаўнікам моў і мэтрам выдалі 52 214 руб., у 1817 г. – 51 343 руб., у 1820 г. – 50 405 руб. Выплаты на забеспячэнне ганаровых пенсіянераў ці эмерытаў, удовам у 1805–1823 гг. не былі пастаяннымі і складалі, за выключэннем 1808 г., ад 4465 руб. (1810 г.) да 9797 руб. (1814 г.) і 17 499 руб. (1816 г.).

Такім чынам, устойлівае фінансавае забеспячэнне дзейнасці шматпрофільнага і шматструктурнага Віленскага ўніверсітэта за кошт асобных грашовых

фондаў, як мэтавых паезуіцкіх даходаў з нерухомых маёнткаў і капіталаў (уключаліся ў асаблівую групу агульнагубернскіх спецыяльных, але не дзяржаўных даходаў), так і бенефіцыяльных збораў, дазваляла яму падтрымліваць у належным стане кадравы патэнцыял вышэйшай кваліфікацыі і матэрыяльна-тэхнічную базу. Вышэйшая навучальная ўстанова ў Вільні мела як сталыя штатныя, так і аднаразовыя непастаянныя выпадковыя звышштатныя фінансавыя сродкі ўтрымання. Да таго ж праўленне Віленскага ўніверсітэта мела магчымасць распараджацца сумамі, якія прызначаліся на іншыя адукацыйныя мэты. Прыход грошай з улікам рэштакаў, за выключэннем 1812–1814 гг., пераўзыходзіў штатнае штогоднае асігнаванне. У той жа час штогодныя расходы за асобныя гады былі ніжэй, а ў некаторыя – вышэй за штатную суму. Гэта было абумоўлена як звышкаштарыснымі грашовымі паступленнямі ў асобныя гады, так і пагашэннем пазык і нявыдачай акладаў у папярэдні час.

Аналіз дынамікі структуры выдаткаў паказвае, што з 1805 па 1823 г. вырасла ўдзельная вага расходаў на выплату жалавання выкладчыкам, дапаможнаму вучэбнаму персаналу, на ўтрыманне дапаможных навукова-даследчых і вучэбных устаноў, паменшыліся сумы гаспадарчых расходаў і амаль нязменнымі засталіся сумы, якія адлічваліся на ўтрыманне адміністрацыйнага персаналу і падрыхтоўку педагагічных кадраў. Больш за палову прыбыткаў выдавалася на аплату працы прафесарска-выкладчыцкага складу. Гаспадарчыя (эканамічныя) выдаткі паглыналі да трэці даходаў. Абсалютная большасць грошай паступала на фінансаванне розных катэгорый персаналу. На падтрымку ў належным стане пераважна нерухомай інфраструктуры Віленскага ўніверсітэта накіроўваліся прыкладна трэць сум. Амплітуда памераў афіцыйных акладаў прафесарска-выкладчыцкага складу сведчыць аб тым, што пры аплаце працы педагогаў улічваўся іх кваліфікацыйны ўзровень: прафесары атрымлівалі прыкладна ў чатыры разы больш, чым лектары.

### Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Шаршунов, В. А.* Виленский университет – «Alma mater» науки и образования Беларуси и Литвы / В. А. Шаршунов // Выш. шк. – 2002. – № 3. – С. 66–70; № 4. – С. 72–76; № 5. – С. 46–49.
2. *Bieliński, J.* Uniwersytet Wileński 1579–1831: w 3 t. / J. Bieliński. – Kraków: Druk Anczyca i Spółki, 1899–1900. – T. 1: Prawa. Urządzenia zewnętrzne. Majątek. – 1899. – 486 s.; T. 3: Nauka. Zebrania. Uwagi ogólne. – 1900. – 734 s.
3. *Beauvois, D.* Szkolnictwo Polskie na Ziemiach Litewsko-ruskich 1803–1832: w 2 t. / D. Beauvois; pzr. I. Kania. – Rym: Fundacja Jana Pawla II; Lublin: Redakcja Wydawnictw KUL, 1991. – T. 1: Uniwersytet Wileński. – 383 s.
4. Полное собрание законов Российской империи: собрание 1-е с 1649 по 12 декабря 1825 г.: в 45 т. – СПб.: Тип. 2-го отд-ния собствен. его император. величества канцелярии, 1830.
5. *Bieliński, J.* [Szeliga]. Reforma Uniwersytetu Wileńskiego i Szkół Jemu Podwładnych za Rektoratu Twardowskiego. Dokumenta Urzędowe z «Teki» Twardowskiego / J. Bieliński [Szeliga] // Archiwum do dziejów literatury i oświaty w Polsce. – Kraków: Drukarnia «Czasu», 1897. – T. 9. – S. 1–135.
6. Сборник постановлений по Министерству народного просвещения. – 2-е изд. – СПб.: Тип. В. С. Балашева, 1875–1876. – Т. 1: Царствование императора Александра I 1802–1825 гг. – 1875. – 1864 стб., 43 с., 44 стб.; Т. 2. Отд. 1. Царствование императора Николая I 1825–1839 гг. – 1875. – 1576 стб., 69 с., 54 стб.
7. *Baliński, M.* Pamiętniki o Janie Sniadeckim, Jego Życiu Przywatnem i Publicznem i Dziełach Jego: w 2 t. / M. Baliński. – Wilno: Nakładem i drukiem J. Zawadzkiego, 1865. – T. 1. – VIII. – 919 s.; T. 2. – 511 s.
8. Сборник материалов для истории просвещения в России, извлеченных из архива Министерства народного просвещения: в 4 т. – СПб.: 1893–1902. – Т. 3: Учебные заведения в западных губерниях 1805–1807 / введ. О. Крыжановского. – СПб.: Тип. А. П. Лопухина, 1898. – XXXVII, CXXVII с., 1186, 92, 200 стб.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2254. Воп. 1. Спр. 4.
10. *Новоселов, А.* Ревизия профессором Сенковским белорусских училищ в 1826 г. Материалы для истории народного просвещения в Северо-Западном крае / А. Новоселов // Журн. М-ва нар. просвещения. – 1872. – Ч. 161, № 5. – Отд-ние 2. – С. 74–122.
11. НГАБ. – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 387.
12. *Rewkowski, Z.* Pamiętniki. T. 1. Wilno. Ostatnie Lata Uniwersytetu. Na Prawach Rękopisu / Z. Rewkowski; z oryginału do druku przygotował, wstąpem i przypisami opatrzył Witold Więsław. – Wrocław: Instytut Matematyczny Uniwersytetu Wrocławskiego, 2011. – 187 s.



### Анатацыя

Артыкул прысвечаны вызначэнню крыніц даходаў, высвятленню структуры і дынамікі грашовага ўтрымання імператарскага Віленскага ўніверсітэта ў 1803–1823 гг. Аналіз даных разнастайных па паходжанні гістарычных крыніц і навуковай літаратуры дае падставу сцвярджаць, што ў структуры выдаткаў вышэйшай навучальнай установы ў Вільні асноўную частку расходаў складалі выплаты, якія прызначаліся для забеспячэння дзейнасці прафесарска-выкладчыцкага складу і розных катэгорый персаналу.



### Abstract

This article is devoted to determining the sources of income, establishing the structure and dynamics of the financial maintenance of Vilnius Imperial University in 1803–1823. The analysis of data from various historical sources and scientific literature suggests that in the structure of expenses of the Vilnius higher education institution, the main share of expenses was made up of payments intended to support the activities of the teaching along with other various categories of staff.